2026 Год белорусской женщины

# ГОД БЕЛАРУСКАЙ ЖАНЧЫНЫ. НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА З НАГОДЫ

**2026 год аб’яўлены ў Беларусі Годам беларускай жанчыны. З гэтай нагоды ў Гродзенскай гімназіі № 7 імя В. Ц. Калакольнікава распачаліся знаёмствы вучняў з выбітнымі жанчынамі горада Гродна.**

11 лютага на сустрэчу з навучэнцамі 4-х класаў, была запрошана дзіцячая пісьменніца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь Ганна Іосіфаўна Скаржынская-Савіцкая.

Мерапрыемства арганізавала і праводзіла намеснік дырэктара па выхаваўчай працы Святлана Міхайлаўна Адамчук. Вучні віталі пісьменніцу яе вершамі.

Ганна Іосіфаўна расказала вучням з чаго пачыналася яе творчая дзейнасць, пазнаёміла са сваімі кнігамі. Расказала, чаму сама ілюстрыруе ўласныя кнігі, і як стварае малюнкі. Пачытала творы на розныя тэмы.

Напярэдадні Тыдня беларускай мовы, прысвечанага Міжнароднаму дню роднай мовы, пісьменніца заахвоціла дзяцей больш чытаць на роднай мове, якую сама вельмі любіць, актыўна папулярызуе і на якой у асноўным піша кнігі.

Затым Ганна Іосіфаўна пазнаёміла аўдыторыю з «Бусяй» – цікавым беларускім часопісам для дзяцей на роднай мове. Заінтрыгавала вучняў, заклікала да чытання часопіса.

Вучні актыўна адгадвалі загадкі, задавалі пытанні пісьменніцы, на якія атрымалі грунтоўныя адказы, нават цытатымі з яе твораў.

Ганна Іосіфаўна падзялілася – над чым працуе цяпер. Расказала, як прыходзіць натхненне, і прачытала свой новы верш «Матчына мова», прысвечаны роднай мове, які напісала напярэдадні мерапрыемства.

Урок прайшоў цікава і захапляльна. Усе вучні атрымалі аўтографы ад пісьменніцы і сфатаграфаваліся разам на памяць. А ў памяці, верагодна, сустрэча застанецца на ўсё жыццё, таму што такія моманты са школьнага дзяцінства – незабыўныя.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая ў гасцях у вучняў Гродзенскай гімназіі № 7 імя В. Ц. Калакольнікава (сустрэча ў межах Года беларускай жанчыны). 11 лютага 2026 года.



Святлана Міхайлаўна прадстаўляе вучням пісьменніцу Г. І. Скаржынскую-Савіцкую





Вучні вітаюць пісьменніцу яе творамі




Цікава: чаму васілёк жыве ў жыце?



Загадкі адгадваць любяць усе





Аўтографы на памяць чытачам



Агульны фотаздымак з вучнямі 4-х класаў

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
"ГИМНАЗИЯ № 7
ИМЕНИ В.Т. КОЛОКОЛЬНИКОВА
Г. ГРОДНО"